# Філасофская думка Беларусі

*Ляўчук М.В., Лойка А.І.*

На працягу існавання нашай краіны адбывалася многа падзей, якія ўплывалі на філасофскую думку Беларусі. Знаходзячыся паміж Усходам і Захадам, наш народ перажываў войны, захваты тэрыторыі. Але якім трагічным не здаваўся лёс Беларусі, былі і станоўчыя моманты. Дзякуючы геапалітычнаму становішчу людзі даведваліся пра розныя культуры і традыцыі народаў, якія заходзілі да нас, пазнавалі навуку іх. Гэта ўсё ўнесла каштоўны ўклад у навуку і філасофію Беларусі.

Першай беларускай дзяржаўнасцю на тэрыторыі сучаснай Беларусі лічаць Полацкае і Тураўскае княствы. У Полацкім княствы самай знакамітай жанчынай, якая прыняла хрысціянства, а затым вяла асветніцкую дзейнасць дзеля міру і спакою, з’яўляецца Еўфрасіння Полацкая. Яна ўздымала тэму сумленнага жыцця чалавека, што сведчаць наступныя радкі яе жыццяпісу: "Кожны дзень павучала сясцёр сваіх: старых вучыла цярплівасці і ўстрыманню; юных жа навучала душэўнай чысціні і цялеснаму супакаенню; хадзе спакойнай, голасу засяроджанаму, слову дабрачыннаму, ядзе і піццю маўкліваму; у адносінах да старэйшых быць пакорлівымі, а мудрых слухаць; да роўных і меншых – любові некрывадушнай; менш казаць, а болей разумець." У Тураўскім княстве таксама быў дзеяч хрысціянства, які закранаў маральныя і этычныя пытанні, грамадска-палітычнае жыццё. І насіў імя ён Кірыла Тураўскі.

Залатым векам у культурнай гісторыі Беларусі лічаць XVI стагоддзе. У гэты час філосафы дакраналіся тэм нацыянальнай і духоўнай самасвядомасці нашага народа. Гэта стагоддзе прыходзіцца на эпоху Адраджэння, дзе галоўным чынам увасобіўся наш знакаміты першадрукар, вучоны і гуманіст Францыск Скарына. Нарадзіўся ў Полацку, дзе атрымаў пачатковую адукацыю. Затым ён паехаў вучыцца ў Кракаўскі ўніверсітэт, дзе ён атрымаў вучоную ступень бакалаўра філасофіі. У сваіх работах па філасофіі ўздымаў тэму

асабістасці, дзе выказаў думку, што вельмі блізка і важна грамадству. У 1517 годзе пераязджае ў Прагу і стварае выдавецтва, у якім надрукаваў і пракаментаваў 23 кнігі Бібліі. Вярнуўся ў Вільна ў 1520 годзе, дзе працягнуў дзейнасць кнігадрукарства. З адыходам на той свет яго мецэнатаў закончыў сваю выдавецкую дзейнасць. Памёр прыблізна ў 1535 годзе ў Празе.

Паслядоўнікамі Францыска Скарыны лічацца Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, якія дзейнічалі з сярэдзіны XVI стагоддзя. У гэты час на тэрыторыі сучаснай Беларусі была Рэфармацыя, якая хацела стварыць евангілічна-рэфарматарскую царкву. Але знаходзячыся паміж Рымам з аднаго боку і Канстантынопалем і Масквой з другога боку, не змагла выканаць усе мэты.

Сымон Будны пры фінансаванні Радзівілам Чорным разгортвае сваю дзейнасць: ён прыязджае ў Вільна ў 1558 годзе і ідзе на пасаду катэхізіста.

Затым са сваімі сябрамі стварае ў Нясвіжы друкарню. Там ён выдае на старабеларускай мове «Катэхізіс» і «О оправдании грешного человека перед Богам», якая не захавалася да нашых часоў. Калі памірае Радзівіл Чорны, Сымон Будны перабіраецца ў Заслаўе. Там ён да канца перакладае Новы Завет. У 1573 годзе пераязджае ў Лоск і выдае Новы Завет з каментарамі і прадмовамі яго самога і кнігу «О главнейших положениях христианской веры».

У апошняй кнізе выказваецца раскрыццё сэнсу хрысціянства, якая руйнавала галоўны догмат святой Тройцы. Як філосаф Сымон Будны абараняў позірк любога чалавека. З падпісаннем Люблінскай уніі Вялікае княства Літоўскае аб’ядналася з Польскім каралеўствам, што стала стварэннем Рэчы Паспалітай. Тым часам у ВКЛ захавалася свая адміністрацыя, войска, заканадаўства і судаводства, беларуская мова.

З другой паловы XVI стагоддзя пачалося развіццё Контррэфармацыі. Яна пакінула для Беларусі многа адмоўных фактаў, але ўнесла вялікі ўклад у інтэлектуальнае жыццё Беларусі.

З трэцім падзелам рэчы Паспалітай Беларусь поўнасцю ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Пачынаючы з сярэдзіны XVIII стагоддзя пад уплывам

капіталістаў і развіццём навукі роля схаластыкі слабее. На змену ёй прыходзіць думка, што чалавек павінен атрымаць спачатку адукацыю. На такую філасофію прыходзяць Антон Скарульскі, Бэнэдыкт Дабшэвіч, Казімір Нарбут. Але не ўсё так аднабакова. Антон Скарульскі не прызнаваў геліяцэнтрычную сістэму Каперніка, класічную механіку Ньютана. Дабшэвіч быў канфармістам, які  згадзіўся з тэорыяй Каперніка. А Казімір Нарбут вагаўся між схаластыкай і адукацыяй і у канцы 70-х гадоў XVIII стагоддзя пачаў прытрымлівацца навукі Каперніка.

Прадстаўніком эпохі Адраджэння ў Беларусі і Літве быў Анёл Доўгірд. Нарадзіўся ў маёнтку Юркаўшчына Мсціслаўскага павету. Вучыўся ў іезуіцкай школе ў Мсціслаўле. Скончыў Віцебскую акадэмію. Потым выкладаў у Лідзе, Віцебску і Шчучыне ў піярскіх вучылішчах. З 1818 года ён чытаў у Віленскім універсітэце лекцыі па логіцы, псіхалогіі і філасофіі.

Яму былі непрыемны ідэі радыкалаў-французаў, якія ў большасці трымаліся дэізму ці відавочнага атэізму. Анёл Доўгірд утрымліваўся заходнехрысціянскай традыцыі нават тады, калі ён цікавіўся дакладнай навукай.

XIX стагоддзе на тэрыторыі Беларусі звязана з паўстаннямі супраць расійскай улады (1830-1831 гг., 1863-1864 гг.). Беларуская інтэлігенцыя хацела вызваліцца з-пад гнёту Расіі і стварыць зноў незалежную дзяржаву Рэч Паспалітую. Але паўстанне было падаўлена царскім урадам. У 1817 годзе стварылася тайнае Таварыства філаматаў, у якое ўваходзілі Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот. Яны хацелі адрадзіць Рэч Паспалітую, увесці канстытуцыйную форму кіравання, адмяніць прыгоннае права.

У 1820 годзе вучні Беластоцкай і Свіслацкай гімназій стварылі Таварыства філарэтаў, якім кіраваў Міхаіл Рукевіч. На тэрыторыі сучаснай Беларусі і Польшчы з 1817 па 1823 гады існавала 50 аб’яднанняў моладзі. Нестабільным часам аказалася і 3-ая палова XIX стагоддзя, дзе рух Беларусі змяняўся хутка. Спачатаку было народніцтва, якое хацела рэшыць аграрнае пытанне. Затым прыйшоў марксізм, прадстаўнікоў якога пачалі называць сацыял-

дэмакратамі. У першай палове XX стагоддзя працягваўся рух сацыял-дэмакратаў. Стварылася першая парты на тэрыторыі Беларусі БСГ (Беларуская сацыяльная грамада), у якую ўваходзілі браты Іван і Антон Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч, Аляксандр Бурбіс.

У перыяд XVIII-XIX стагоддзяў філосафамі нашай краіны з’яўляліся Алаіза Пашкевіч(Цётка), Францішак Багушэвіч, Кастусь Каліноўскі, Максім Багдановіч, Якуб Колас, удзельнікі Таварыстваў філаматаў і філарэтаў.

Алаіза Пашкевіч нарадзілася ў фальварку Пясчына Лідскага павета. Пачатковую асвету атрымлівала ад дарэктараў. Потым скончыла сямікласнае вучылішча Прозаравай. У 1903 годзе паступіла, але не скончыла курсы выхавацелек і кіраўніц фізічнай адукацыі ў Санкт-Пецярбургу. З гэтага часу пачала пісаць кнігі, дзе разгортвала тэмы лёсу Беларусі. У 1904 годзе пераехала ў Вільню, дзе працавала фельчаркай у бальніцы.

У 1906 годзе апынулася ў Львове. Там яна пісала зборнікі вершаў (напрыклад, «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду»), якія ўздымалі тэмы: патрыятычна-аптымістычныя, рэвалюцыйна-гераічныя. Толькі ў 1911 годзе змагла вярнуцца ў Вільна, дзе працягвала пісаць вершы і апавяданні. Захварэла на тыф і адышла на той свет у 1916 годзе. У яе апавяданнях прасочваецца гуманізм, несправядлівасць і цяжкасць працы чалавека.

У 1914 годзе сваёй публіцыстыкай заклікала людзей захоўваць родную беларускую мову. Стваральнік беларускай літаратуры Якуб Колас у сваіх творах уздымаў беларускую прыроду ва ўсёй яе красе, глыбокую псіхалогію беларускага сялянства. Пра яго пісалі нават замежныя пісьменнікі. Напрыклад, Вера Рыч – англійская перакладчыца – параноўвала паэму «Новая Зямля» з творамі Шэкспіра.

З надыходам савецкай улады ў 1922 годзе на тэрыторыі Беларусі паступова прыходзіць новы этап філасофскай думкі, у якім галоўным чынам адлюстроўваецца метадалогія. Мінская метадалагічная школа дапамагла ў

гэтым вучэнні. Было шмат чаго абнаўлено і дадана. Напрыклад, былі рэканструяваны механізмы развіцця і функцыянавання тэорыі, вывучаны функцыі картын свету. У XXI веку беларуская філасофія вывучае такія напрамкі, як:

Метадалогію навуковых даследаванняў;

Эфектыўнасць развіцця беларускай нацыянальнай мадэлі грамадскага развіцця, устойлівай свядомасці;

Абгрунтаванне стратэгіі дзейнасці беларускага грамадства, якая ставіць увагу на патэнцыял роднага краю.

## Сознание и искусственный интеллект

***Косуров Р.А., Лойко А.И.***

*«Весь явленный нам мир сконструирован сознанием, нам недоступна реальность вне нашего сознания.»*

*Георг Вильгельм Фридрих Гегель*

Тема сознания и искусственного интеллекта становится все более актуальной в современном мире, где технологии развиваются с небывалой скоростью. Вопрос о том, возможно ли создать искусственный интеллект с сознанием человека и что это сознание собой представляет, вызывает множество споров как в научных, так и в философских кругах. Научная работа посвящена анализу ключевых проблем и угроз, возникновение которых связанно со стремительным развитием технологий искусственного интеллекта и в последствии наделения его сознанием человека.

Сознание – вопрос, который поднимался многими учёными и философами на протяжении многих веков. Но, на протяжении большей части XX века существовало строгое табу на изучение таинственного внутреннего мира сознания – считалось, что это неподходящая тема для «серьёзной науки». С тех